БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ
ГІСТАРЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ

# БЕЛАРУСЬ У ЭПОХУ ГЕАПАЛІТЫЧНЫХ І САЦЫЯЛЬНЫХ ЗРУХАЎ НОВАГА І НАВЕЙШАГА ЧАСУ

Да 25-годдзя кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу
гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

Матэрыялы
міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі

Мінск, 22 лістапада 2019 г.

Мінск
БДУ
2019

УДК 94(476)"19/20"(06)
ББК 63.3(4Беи)я431
Б43

Рэдакцыйная калегія:
доктар гістарычных навук прафесар *А. Г. Каханоўскі* (старш.);
доктар гістарычных навук прафесар *П. І. Брыгадзін*;
кандыдат гістарычных навук дацэнт *А. В. Бурачонак*;
доктар гістарычных навук прафесар *А. А. Гужалоўскі*;
доктар гістарычных навук прафесар *У. К. Коршук;*
доктар гістарычных навук прафесар *С. М. Ходзін*;
кандыдат гістарычных навук дацэнт *В. С. Макарэвіч* (адказ. рэд.);
кандыдат гістарычных навук дацэнт *А. М. Максімчык* (адказ. сакратар);
кандыдат гістарычных навук дацэнт *А. І. Малюгін;*
кандыдат гістарычных навук прафесар *А. А. Яноўскі*

Рэцэнзенты:
доктар гістарычных навук, прафесар *В. Г. Шадурскі*;
кандыдат гістарычных навук, дацэнт *В. В. Даніловіч*

Б43 **Беларусь** у эпоху геапалітычных і сацыяльных зрухаў Новага і Навейшага часу. Да 25-годдзя кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта : матэрыялы міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 22 лістап. 2019 г. / Беларус. дзярж. ун-т ; рэдкал.: А. Г. Каханоўскі (старш.) [і інш.]. – Мінск : БДУ, 2019. – 355 с.
ISBN 978-985-6144-97-7.

Змешчаны матэрыялы міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, падрыхтаваныя даследчыкамі з Беларусі, Расіі, Украіны, Чэхіі і Польшчы. Разглядаецца шырокі спектр актуальных пытанняў сацыяльнай, палітычнай, эканамічнай гісторыі Беларусі, развіцця беларускай дзяржаўнасці ва ўмовах геапалітычных зрухаў Новага і Навейшага часу і міжнародных выклікаў XX ст., абвяшчэння незалежнасці Рэспублікі Беларусь і станаўлення прэзідэнцкай палітычнай сістэмы ў краіне, развіцця геапалітычнага патэнцыяла Беларусі ва ўмовах інтэграцыйных і глабалізацыйных працэсаў сучаснасці.

**УДК 94(476)"19/20"(06)**
**ББК 63.3(4Беи)я431**

**ISBN 978-985-6144-97-7**
© БДУ, 2019

8. Оржеховский И. В. Самодержавие против революционной России (1826–1880 гг.). М. : Мысль, 1982.
9. Полное собрание законов Российской империи: собрание 2-е с 1825 по 1881 г.: в 55 т. СПб.: Типография 2-го отделения собственной его императорского величества канцелярии, 1830–1862.
10. Полное собрание законов Российской империи: собрание 1-е с 1649 по 12 декабря 1825 г.: в 45 т. СПб.: Типография 2-го отделения собственной его императорского величества канцелярии, 1830.
11. Романов, В. В. Местные органы политической полиции Российской империи: структура, компетенция, основные направления деятельности в 1826–1860 г.: на материалах Поволжья : дис. … докт. истор. наук : 07.00.02. Ульяновск, 2008.
12. Селиванов, В. В. Предания и воспоминания. СПб. : Типо-литография А.Е. Ландау, 1881.

УДК 94(476)«19/20»

## ЗАХАВАННЕ КАТАЛІЦКАЙ КАНФЕСІЙНАЙ ІДЭНТЫЧНАСЦІ ПЕРАВЕДЗЕНЫМ У ПРАВАСЛАЎЕ НАСЕЛЬНІЦТВАМ (ДРУГАЯ ПАЛОВА XIX – ПАЧАТАК XX ст.): ПРЫКЛАД ВАЛМЯНСКАЙ ПАРАФІІ МІНСКАГА ПАВЕТА

***М.М. Кароль***
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г.Мінск, Беларусь, karolmarharyta@gmail.com*

У артыкуле аналізуецца становішча жыхароў Валмянскай воласці Мінскага павета Мінскай губерні, якія былі пераважна прымусова пераведзены ў праваслаўе пасля закрыцця мясцовага касцёла ў другой палове 60-х гг. XIX ст. Адзначаецца, што былыя каталікі не пагаджаліся на прыняцце новага веравызнання, імкнуліся атрымаць дазвол вярнуцца ў заходні абрад, а пасля адмоў у гэтым таемна захоўвалі каталіцкую ідэнтычнасць. Звяртаецца ўвага на тое, што пасля выдання ў 1905 г. указа аб асновах верацярпімасці значная частка насельніцтва былой Валмянскай парафіі нанава прыняла ў каталіцызм.
***Ключавыя словы:*** *каталіцызм; праваслаўе; канверсія; Волма; Мінскі павет; Расійская імперыя.*

## СОХРАНЕНИЕ КАТОЛИЧЕСКОЙ КОНФЕССИОНАЛЬНОЙ ИДЕНТИЧНОСТИ ПЕРЕВЕДЕННЫМ В ПРАВОСЛАВИЕ НАСЕЛЕНИЕМ (ВТОРАЯ ПОЛОВИНА XIX – НАЧАЛО XX в.): ПРИМЕР ВОЛМЯНСКОГО ПРИХОДА МИНСКОГО УЕЗДА

***М.М. Король***
*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г.Минск, Беларусь, karolmarharyta@gmail.com*

В статье анализируется положение жителей Волмянской волости Минского уезда Минской губернии, преимущественно принудительно переведенных в православие после закрытия местного костела во второй половине 60-х гг. XIX в. Отмечается, что бывшие католики не соглашались на принятие нового вероисповедания, стремились получить разрешение вернуться в западный обряд, а после отказов в этом тайно сохраняли католическую идентичность. Обращается внимание на то, что после издания в 1905 г. указа о началах веротерпимости значительная часть населения бывшего Волмянского прихода заново приняла в католицизм.
***Ключевые слова:*** *католицизм; православие; конверсия; Волма; Минский уезд; Российская империя.*

## PRESERVATION OF CATHOLIC CONFESSIONAL IDENTITY BY THE POPULATION CONVERTED TO ORTHODOXY (THE SECOND HALF OF THE XIX – THE BEGINNING OF THE XX CENTURY): THE CASE OF THE VOLMA'S PARISH OF MINSK DISTRICT

***M. Karol***
*Belarusian State University, Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Belarus, karolmarharyta@gmail.com*

The article analyzes the situation of the population of the Minsk district of the Minsk governorate, who were forcibly converted to Orthodoxy after the closure of the local Catholic church in the second half of the 19th century. It is noted that former Catholics did not agree to the taking of a new religion, sought to obtain permission to return to the Western rite, and after refusing this secretly kept their Catholic identity. Attention is

drawn to the fact that after the decree of "On tolerance development" was issued in 1905, a significant part of the population of the former Volma's parish was converted to Catholicism again.
***Key words:*** *Catholicism; Orthodoxy; conversion; Volma; Minsk district; Russian Empire.*

Мэтанакіраваная дзейнасць расійскай адміністрацыі па пераводзе часткі каталіцкага і былога ўніяцкага насельніцтва ў праваслаўе, пік якой прыпаў на другую палову 60-х гг. XIX ст., істотна адбілася як на міжканфесійным балансе ў рэгіёне, так і на лёсах канкрэтных рэлігійных грамадаў і нават асобных людзей. Здараліся выпадкі, калі з каталіцызму ў праваслаўе пераводзіліся цэлыя населеныя пункты. Адзін з іх адбыўся ў мястэчку Волма Мінскага павета Мінскай губерні (таксама змянілі веравызнанне і жыхары суседніх вёсак) і справакаваў шматгадовае змаганне – як адкрытае, так і таемнае – мясцовага насельніцтва за ўласную канфесійную прыналежнасць.

У Волме каталіцкі касцёл быў ліквідаваны ў 1866 г. [1, арк. 1-1 адв.]. Станькаўскі благачынны Пётр Трускоўскі абгрунтоўваў такія меры тым, што першапачаткова гэта была праваслаўная царква, перабудаваная ў 1720 г. ва ўніяцкую [1, арк. 1]. У выніку пры ўдзеле святароў, міравога пасрэдніка, жандараў і тысяцкіх у 1866 г. у праваслаўе было пераведзена 2043 чалавекі. У 1867 г. мясцовы касцёл пераасвяцілі ва Успенскую царкву. Святаром у яе быў прызначаны Міхаіл Сямёнавіч Валачковіч, які сярод сваіх шматлікіх узнагарод меў цёмна-бронзавы медаль за спрыянне падаўленню паўстання 1863–1864 гг. [2, арк. 9 адв.]. Праз тры гады колькасць парафіян складала 1628 чалавек. У пераважнай большасці гэта былі былыя каталікі, якіх у адпаведнасці з тагачаснай тэрміналогіяй называлі «новадалучанымі».

Адзначым, што непасрэдны перавод прыхаджан былой каталіцкай парафіі ў праваслаўе і ліквідацыя касцёла ў Волме прайшоў адносна спакойна. Аднак ужо ў апісанні прыходаў Мінскай губерні ад 1874 г. звярталася ўвага на тое, што ў рэлігійных адносінах новыя парафіяне Валмянскай царквы яшчэ не засвоілі правілы і абрады праваслаўнай царквы і былі «няўважлівымі» ў іх выкананні [11, с. 54].

Пры гэтым з самога моманту пераводу жыхары Валмянскай парафіі пісалі прашэнні і скаргі на імя генерал-губернатара, у якіх звярталі ўвагу на гвалт і шантаж з боку мясцовых чыноўнікаў пры ажыццяўленні працэдуры далучэння да праваслаўя. Сяляне вёсак Васілеўшчына, Швабоўшчына і Цюхаі Мінскага павета на чале з Восіпам Рэдзькам і Восіпам Кулём скардзіліся на тое, што былы станавы прыстаў Іван Плахаў у 1867 г. па «невядомым нам распараджэнні патрабаваў, каб мы ўсе прынялі праваслаўе і катаваў нас рознымі здзекамі, якіх на пісьме выказаць няможна» [8, арк. 30 адв.]. Яны сцвярджалі, што самі яны, як і іх продкі, належалі да каталіцкага веравызнання, і патрабавалі кампенсаваць ім нанесены ўрон, ацэньваючы яго ў 936 рублёў 23 капейкі [8, арк. 38].

У 1868 г. двое сялян вёскі Загараны Мінскага павета Ігнат Барысевіч і Юзаф Адамовіч падалі скаргу на святара Валмянскай царквы, міравога пасрэдніка і станавога прыстава. Да 1866 г. І. Барысевіч і Ю. Адамовіч разам са сваімі сем'ямі былі каталікамі, але ў 1866 г. іх запісалі ў праваслаўныя прыходскія кнігі. І. Барысевіч казаў, што, скарыстаўшыся яго адсутнасцю дома, у праваслаўе ахрысцілі нованароджаную дачку. Сяляне два гады не выконвалі ні каталіцкіх, ні праваслаўных абрадаў і прасілі мінскага губернатара і архіепіскапа мінскага і бабруйскага Аляксандра выключыць іх разам з сем'ямі з праваслаўя і дазволіць вярнуцца ў каталіцтва [6, арк. 2–4 адв.].

Ю. Адамовіч даў паказанні, што ідэя падаць прашэнне нарадзілася ў яго, калі ён даведаўся, што сяляне вёскі Лапаціна выпадкова дазналіся, што іх няма ў спісах праваслаўнай царквы, таму ён спадзяваўся, што можа таксама прасіць аб выключэнні яго са спісаў і вяртанні ў каталіцызм, бо жонка і старэйшыя дзеці праваслаўя не прымалі [6, арк. 6 адв.]. Аднак, даведаўшыся, што гэта не з'яўляецца магчымым, ён пагадзіўся застацца ў праваслаўі і выконваць абрады паводле яго правілаў. Таксама ён паабяцаў ахрысціць у праваслаўе свайго нованароджанага сына. У сваю чаргу, з І. Барысевічам павінен быў праводзіць пастырскія гутаркі святар М. Валачкевіч, каб пераканаць таго пачаць наведваць царкву.

Селянін мястэчка Волма Казімір Калакта скардзіўся, што ў ліпені 1869 г., па распараджэнні міравога пасрэдніка і валаснога старасты, былі дасланы да яго «на пастой» восем казакоў, якія нанеслі шкоды гаспадарцы на 50 рублёў 40 капеек [8, арк. 31].

Апроч таго, п'яныя казакі білі сялян нагайкамі і прымушалі прымаць праваслаўе. Сяляне вышэйзгаданых вёсак Швабоўшчына, Васілеўшчына, Цюхаі падалі сем прашэнняў пра гэта, дзе распісвалася колькасць з'едзенага і выпітага казакамі. Прашэнні былі напісаны па адным шаблоне і адным почыркам. Ва ўсіх сяляне

скардзіліся на свавольствы казакоў, якія, сярод іншага, прывялі да разбурэння гаспадарак. У пераважнай большасці яны адзначалі той факт, што святар звяртаўся па дапамогу да казакаў, каб з дапамогай фізічнай сілы прымусіць сялян выконваць абрады па правілах праваслаўнай веры. Жыхар вёскі Васілеўшчына Міхаіл Залатар у сваім прашэнні скардзіўся, што казакі сілай гналі яго у царкву на споведзь, а святар М. Валачкевіч прымушаў яго ахрысціць нованароджанага сына ў праваслаўе. Казакі стаялі ў падворку М. Залатара чатыры тыдні, пакуль той не пагадзіўся на высунутыя ўмовы [8, арк. 33].

Такім чынам, нягледзячы на адстунасць выразнага ўзброенага супраціўлення, пасля закрыцця касцёла і пераводу насельніцтва ў праваслаўе, мясцовая адміністрацыя і святар М. Валачкевіч сутыкнуліся з актыўным непрыняццем новага стану рэчаў з боку жыхароў воласці.

Самым распаўсюджаным спосабам супраціўлення гвалтоўнаму пераводу было фактычнае невыкананне праваслаўных абрадаў. Сяляне вёсак Сурцыны і Хімароды Іван Антонавіч Чарняўскі і Іван Іосіфавіч Хімарода, якія першапачаткова трымаліся абрадаў праваслаўнай веры, у 1869 г. перасталі наведваць у царкву, пакідалі без хрышчэння народжаных дзяцей, самі ажыццяўлялі пахаванні памерлых. Нягледзячы на тое, што накіраваны да іх чыноўнік давёў ім, што «новадалучаныя» ніколі не змогуць вярнуцца ў каталіцызм, а Валмянская царква ніколі не будзе ператворана ў касцёл, пазіцыя сялян не змянілася. У выніку мясцовыя ўлады ўсклалі віну за «падбухторванне» да невыканання праваслаўных абрадаў на мясцовага селяніна Івана Лапу, якога таксама абвінавацілі ў зборы грошай для напісання прашэнняў аб вяртанні ў каталіцызм, у далейшым яго адаслалі ў Мінск для разбіральніцтваў [8, арк. 6].

Нежаданне сялян заставацца ў праваслаўе часам прыводзіла да складанасцей у ажыццяўленні заканадаўчых працэдур, ніякім чынам не звязаных з рэлігіяй. Судовы следчы Мінскага павета падчас следства па справе «аб крадзежы бульбы ў Шулінскага і Ігнатовіча» не змог правесці неабходны допыт сведак. Сяляне вёскі Якуты Валмянскага грамады адмовіліся выканаць прысягу, абгрунтоўваючы гэта тым, што яны былі гвалтоўна запісаны ў праваслаўе, а таму не жадаюць прысягаць святару, а патрабуюць для гэтага ксяндза Ракаўскага касцёла. Калі следчы прыгразіў штрафамі, незадаволенасць сунялася, але затым аднавілася. Сярод сялян найбольш актыўна выказваўся Іван Грыгаровіч. Па словах следчага, на спробы яго супакоіць І. Грыгаровіч адказваў «дзёрзка і нахабна», і толькі пасля яго сыходу, іншых прысутных сялян угаварылі выканаць прысягу [7, арк. 17 адв.].

Епіскап Аляксандр рапартаваў 26 ліпеня 1869 г., і прадстаўляў ведамасць, што некаторыя прыхаджане, далучаныя да праваслаўя ў 1866 г., спраўна хадзілі на споведзь, але ў 1869 г. перасталі наведваць царкву. Вінаватымі былі прызнаны Адам Лапа і Юрый Прыстрома, якія распусцілі чуткі, што, тыя хто не быў на споведзі ў гэтым годзе, застануцца каталікамі, і што быццам бы гэта сказана А. Лапу і Ю. Прыстрому «епіскапам Вайткевічам»* [7, арк. 23адв.]. Колькасць тых, хто не наведваў Валмянскую праваслаўную царкву ў 1869 г., уражвае – па афіцыйных звестках, на споведзь не з’явілася 129 мужчын і 88 жанчын [7, арк. 27 адв.].

Святар Валмянскай царквы М. Валачкевіч таксама дакладваў, што 13 красавіка 1869 г. царкоўны стараста Адам Трызна пасля богаслужэння зайшоў у карчму, дзе сустрэў шмат народу, а таксама гаспадара – арандатара карчмы Яновіча. Той запытаў, ці шмат было людзей на службе, на што А. Трызна адказаў, што было 60 чалавек на споведзі і іншыя «багамольцы». На што Яновіч адзначыў, што цяжка будзе прымусіць жыхароў Волмы хадзіць у праваслаўную царкву, бо памешчык Леан Ваньковіч мае намер будаваць у сваім фальварку Набароўшчына каменны касцёл, да якога будуць прыпісаны ўсе парафіяне Волмы, а таксама прыхаджане ліквідаванага Івянецкага касцёла [7, арк. 20адв.].

Апроч таго, сяляне сталі смяяцца з А. Трызны, што той трымаецца праваслаўя, і сказалі «дык і нас цяпер просяць, а мы і слухатц не жадаем, вось былі два чыноўнікі, якія прызналі нас каталікамі» [7, арк. 20 адв.].

Вялікую ролю ў «валмянскай справе» адыгрывалі чуткі, якія распаўсюджваліся сярод насельніцтва і ўплывалі на іх нежаданне выконваць абрады па правілах праваслаўнай веры. Святар М. Валачкевіч даносіў, што, пасля далучэння Валмянскай воласці да Вялікасельскага праўлення, мясцовае насельніцтва была ўсцешана гэтым

---

* Адам Вайткевіч (1796–1870) – біскуп каталіцкі мінскі (1852–1869).

фактам, бо цяпер да іх перастануць ездзіць чыноўнікі, а таксама ў святара не будзе магчымасці часта праводзіць з імі размовы аб неабходнасці выканання праваслаўных абрадаў. Апроч таго, яны спасылаліся на невядомага чалавека, які нібыта спрычыніўся да закрыцця праўлення, і што менавіта ён дапаможа ім у хуткім часе далучыцца да парафіі Ракаўскага касцёла. Нарэшце, сяляне распаўсюджвалі чуткі аб «вядомым ім чалавеку», які адкрые у Волме касцёл. У выніку распаўсюду такіх чутак на адну з нядзельных службаў у царкву ніхто не прыйшоў [7, арк. 27 адв., 39–39 адв.].

Таксама была распачата справа супраць уладальніка маёнтка Яхімава Пратасевіча, які разносіў чуткі, што былы міравы пасрэднік Балоцін быў звольнены з пасады і арыштаваны за перавод сялян у праваслаўе і закрыццё касцёла [7, арк. 59 адв.].

Нельга сказаць, што былыя парафіяне ліквідаванага касцёла засталіся без пастырскай падтрымкі ксяндза. У 1875 г. епіскап бабруйскі і мінскі Аляксандр паведамляў мінскаму губернатару У. Токараву пра дзеянні ксяндза Ракаўскага касцёла Адама Пласкавіцкага. У адпаведнасці з дадзенай епіскапам характарыстыкай, ксёндз быў вядомым «фанатыкам і прапагандыстам», пры споведзі ўнушаў каталікам нянавісць да ўсяго рускага і праваслаўнай веры, загадваў ім ніколі не наведваць праваслаўнай царквы [9, арк. 2]. Для яшчэ большага «ачарнення» ксяндза епіскап прыпісваў яму ўдзел у паўстанні 1863–1864 гг., але доказаў не прыводзіў. Дзейнасць ксяндза была накіравана, у тым ліку, і на дапамогу прыхаджанам Валмянскай праваслаўнай парафіі. Каб яе спыніць, праваслаўны епіскап прапанаваў выдаліць ксяндза А. Пласкавіцкага з Ракава.

Таксама пераведзеныя ў праваслаўе сяляне хадзілі на споведзь да былога ксяндза ліквідаванага Валмянскага касцёла Віктара Андрыеўскага, а часам даязджалі нават да ксяндзоў у Мінск, імёны якіх яны адмовіліся назваць падчас следства [8, арк. 1].

У 1880 г. Мінская праваслаўная кансісторыя паведамляла ў Мінскае губернскае праўленне, што жыхары мястэчка ў колькасці 20 чалавек (10 пар) былі абвенчаны ксяндзом па каталіцкім абрадзе [10, арк. 2 адв.]. Паводле законаў Расійскай імперыі, такія змяшаныя шлюбы, заключаныя ў касцёле, лічыліся несапраўднымі да моманту вянчання ў царкве. Таму мінскаму павятоваму спраўніку прадпісалі «разлучить от совместного жительства» асоб, якія павянчаліся паводле каталіцкага абрада [10, арк. 3]. Зразумела, што жыхары Волмы, супраць якіх была распачата справа, выказалі незадавальненне і адмовіліся выконваць пастановы аб «раз’яднанні» [10, арк. 4].

Гвалтоўны перавод у праваслаўе ў Волме, які праводзіўся падназіраннем атрадаў казакаў, знайшоў сваё адлюстраванне і ў тагачаснай прэсе. «Goniec Wileński» ў 1909 г. апісваў працэс пераводаў, які мала чым адрозніваўся ад паказанняў сялян у 1869 г. Газета паведамляла, што ў 1905 г., пасля выдання ўказа аб асновах верацярпімасці, у парафіі толькі святар і яго сям’я засталіся праваслаўнымі. Парафіяне арганізавалі часовую капліцу, у якую раз на месяц прыязджаў ксёндз з Ракава [12, s. 2]. Зразумела, што згадка пра вяртанне ўсіх парафіян у каталіцызм – гэта мэтанакіраванае перабольшанне. Аднак калі ў 1890 г. колькасць парафіян царквы складала 2610 чалавек [3, арк. 20], у 1903 г. – 3313 [4, арк. 19], то ў 1912 г. ужо засталося толькі 919 [5, арк. 23], што яскрава сведчыць пра масавы адыход ад праваслаўнага веравызнання і, тым самым, захаванне жыхарамі Валмянскай парафіі сваёй каталіцкай ідэнтычнасці на працягу 40 гадоў. Сам будынак касцёл у Волме быў вернуты каталіцкім вернікам у 1918 г., а ў 1935 г. парафія налічвала 2150 чалавек [13, s. 103].

Нягледзячы на фармальнае і вонкава добраахвотнае далучэнне каталікоў да праваслаўнай царквы, якое адбылося ў Валмянскай парафіі ў 1866 г., амаль адразу мясцовыя жыхары пачалі дамагацца вяртання ў шэрагі вызнаўцаў заходняга абраду. Адзінай законнай магчымасцю для гэтага была падача прашэнняў на імя прадстаўнікоў свецкай адміністрацыі і царкоўных іерархаў. Але ў дадзеным выпадку (як і ў большасці падобных сітуацый) такія прашэнні не задавольваліся. У выніку сяляне вымушаны былі падтрымліваць уласную канфесійную ідэнтычнасць праз таемнае наведванне касцёлаў у іншых мясцінах і ігнараванне набажэнстваў і абрадаў у тутэйшай праваслаўнай царквы. Толькі пасля 1905 г. былыя каталікі змаглі адкрыта выказаць сваю прыналежнасць да рымскага абраду, што, сярод іншага, праявілася ў істотным змяншэнні колькасці праваслаўных у даследаваным мікрарэгіёне.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей – НГАБ). Ф. 136. Воп. 1. Спр. 31411. Справа аб скасаванні каталіцкага касцёла м. Волма, маёнт. Занеўшчына Мінскага павета. 1866–1874 гг.,

2. НГАБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 40902. Кліравыя ведамасці цэркваў Мінскага павета. 1870 г.
3. НГАБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 41032. Кліравыя ведамасці цэркваў Мінскага павета. 1890 г.
4. НГАБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 41134. Кліравыя ведамасці цэркваў Мінскага павета. 1903 г.
5. НГАБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 41145. Кліравыя ведамасці цэркваў Мінскага павета. 1912 г.
6. НГАБ. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 1919. Справа аб прымусе сялян каталіцкага веравызнання да прыняцця праваслаўя святаром Валмянскай царквы. 21.12.1868–10.01.1869.
7. НГАБ. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 2015. Справа аб невыкананні прыхаджанамі Валмянскай царквы абрадаў праваслаўнай царквы. 12.01.1869–05.01.1871.
8. НГАБ. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 2176. Справа аб прыняцці мінскімі ксяндзамі на споведзь сялян Валмянскай воласці, якія далучыліся да праваслаўя. 24.08–21.12.1870.
9. НГАБ. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 2795. Справа аб процізаконных учынках ксяндза Ракаўскага касцёла А. Пласкавіцкага. 06–10.09.1875.
10. НГАБ. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 3526. Справа аб адмове прыхаджан Валмянскай царквы, абвенчаных паводле каталіцкага абраду, нанава ўступаць у шлюб паводле праваслаўнага абраду. 10.01–16.05.1880.
11. Описание церквей и приходов Минской епархии, составленное по официально затребованным от причтов сведениям. Т. 1: Минский уезд. Минск: Типолитография Б. И. Соломонова, 1878.
12. Goniec Wileński. 01.07.1909. № 145.
13. Spis Kościołów i Duchowieństwa Diecezji Pińskiej w Rzeczypospolitej Polskiej 1935 r. – Pińsk: Wyd-wo Drukarni Diecezjalnej, 1935.

УДК 94-053.2(476) “18/19”

## БЕЛАРУСКАЯ СЯМ’Я НА МЯЖЫ XIX–XX СТАГОДДЗЯЎ У САЦЫЯЛЬНА-ДЭМАГРАФІЧНЫМ ВЫМЯРЭННІ

***І.В. Лебедзева***
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр.Незалежасці, 4, 220030, г.Мінск, Беларусь, Lebedzeva@mail.ru*

Аналізуюцца працэсы пераходу беларускага грамадства ад традыцыйнага да індустрыяльнага шляху развіцця. Адзначана, што ў сувязі з імклівымі працэсамі трансфармацыі сацыяльнай структуры адпаведныя змены адбываюцца і ў сям’і. Зроблена выснова аб тым, што пад уздзеяннем гэтых працэсаў спачатку па ініцыятыве органаў улады, а потым і пры удзеле розных прыватных аб’яднанняў быў легітымна аформлены інстытут дзяцінства і сфарміраваны комплекс мер па абароне жанчын і дзяцей.

***Ключавыя словы:*** *індустрыяльнае грамадства; сям’я; сямейная абшчына; шлюб; інстытут дзяцінства; дзіцячая смяротнасць; дэмаграфічны пераход; народныя і царкоўнапрыхадскія школы; прыхадскія вучылішчы.*

## БЕЛОРУСКАЯ СЕМЬЯ НА РУБЕЖЕ XIX–XX ВЕКОВ В СОЦИАЛЬНО-ДЕМОГРАФИЧЕСКОМ ИЗМЕРЕНИИ

***И.В. Лебедева***
*Белорусский государственный университет, пр.Независимости, 4, 220030, г.Минск, Беларусь, Lebedzeva@mail.ru*

Анализируются процессы перехода белорусского общества от традиционного к индустриальному пути развития. Отмечено, что в связи со стремительными процессами трансформации социальной структуры соответствующие изменения происходят и в семье. Сделан вывод о том, что под влиянием этих процессов первоначально по инициативе органов власти, а потом и при участии различных частных объединений был легитимно оформлен институт детства и сформирован комплекс мер по защите женщин и детей.

***Ключевые слова:*** *индустриальное общество; семья; семейная община; брак; институт детства; детская смертность; демографический переход; народные и церковноприходские школы; приходские училища.*

## BELARUSIAN FAMILY ON THE EDGE OF XIX – XX CENTURIES IN SOCIO-DEMOGRAPHIC DIMENSION

***I. Lebedeva***
*Belarusian State University, Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Belarus, Lebedzeva@mail.ru*